# Венанцы Бутрым



* * *

Першы сьнег, беспрычынная радасьць!
На гарачыя вусны рабін –
пацалункі халодныя градам...
Сьмех таропкі ад гнуткіх галін...
Стынуць пальцы, падступна халодзіць
прытуманены шэраньню стан.
О, спрадвечна салодкі падман,
ты, чаканьне, сумненьняў разводдзе!..

З кузьні звон, перастукі. Бунтуе
ў гулкім горане полымя шар,
ды абняты дрымотай абшар
нат уласнага сэрца ня чуе...

Будзе ноч насьцярожана сьветлая
сілуэты лічыць збоч дарог...

* * *

Млява шэпчуць стамлёныя губы –
лісьце скаргу бясконца вядзе
у чаканьні бяды або згубы:
навальні... Навальніца ідзе!..

– Адарвешся ад роднай галіны –
і выгнаньне – жабрацтва і сьмерць!
Гоман дробны, глухі, безупынны:
– Што ж цяпер? Што ж цяпер?..

Сіне-белым ускінецца ў хмарах –
траціш слых і цямнее ў вачах,
бо зарніцай біблейскіх пажараў
працінае зьнямелы абсяг...

А ў тунелі начнога маўчаньня
занясе, паўтараючы зноў,
то азёрна-аернаю тваньню,
то жывіцай прагрэтых лясоў...

Што ж цяпер? Пад нажамі маланак
кіламетры расьпятай зямлі
у надзеі, жаданьні спантанным
каб дажджы стараной не прайшлі...



Ну а мне? Тэлефон не пакліча.
Ліпне духмень на рукі і твар.
І дрыжыць –
на суцэльнасьць разьлічаны!.. –
на фрагменты ірвецца абшар:

то губляюць камлі мае дрэвы,
то між хмарамі кроны нясе.
І грыміць на паўтор, перапевам,
што, нядбайны, я страціў цябе...

* * *

*В. В-у*

Кінем усё і на досвітку едзем,
у дробнай хвалі губляць паплаўкі...

Дальні бор і аблокі-суседзі
між драцін патанулай лазы;
цела светлае ў цёмнай кашулі –
цягне век свой крывуля-вярба;
і над грудам, дзе продкі паснулі,
тлуміць ветрам кірмаш варання.

Проці сонца іскрыць павуцінне,
спеюць словы, ўбіраючы сінь...
Хай мой голас тут раптам загіне,
толькі ты, дарагая, не згінь!
Сотня год – толькі кропля расы
на спакойным аблічча тваім...

* * *

*М.М.Ш.*

Цякуць гады. І часу плынь нясе
ўсё новую вясну, як і мяне з табою.
Ты ведаеш, і я перад сабой не ўтою,
што набліжаемся да мэты пакрысе.

Адным знайдзёнкаю, а іншым – горкай
згубаю

ператасуецца часамі ўсё, нібы калода
карт:
з кахання – лёгкі ці нікчэмны жарт
і недарэчны фарс – з работы любай.

Ды што! Вось жнівень дабівае дні,
і хутка астрам дацвітаць на карані...

Ўжо неба пачало хіліцца долу,
твар месяца зліняў ад смутку і турбот –
быў сёння першы павуціння лёт:
спакойна ўпэўнены, хаця яшчэ і кволы.

* * *



Апалі чакання аковы!
Заняты адным суцэла,
зноў цягнеш, вырай чарговы,
на Піну, Басфор, Дарданелы...
...Унізе поўня на ўсходзе
ныраe ў тонкія хмары.
Ды буйна зоры ўзыходзяць
над вамі ў чорным абшары...

На ўзлёт! І парывам, не тлумам,
і ўжо толькі смерць вас супыніць,
крылы павяжа самумам
ускрай Аравійскай пустыні.
Не зважыць, што вы – жывыя,
на ўзгоркі бязводныя кіне.
І зноў пераможа стыхія
ускрай чарговай пустыні...
Яшчэ раз – ужо каторы!–
вам, дробным, сіл не хапіла –
жывое змяла без разбору
сляпая варожая сіла.
Віруе шэрае пер’е
над бурым каменнем бясконцым,
ды шэлест пясчанага зерня
пад бельмам засмяглага сонца...

А будуць чакаць пад Валожынам
палі ў красавіцкіх туманах.



І нехта штодзень заварожана
будзе вышукваць старанна
за Ісланчу, ў небе абноўленым,
аздобленым сонца каронай,
лёт дзіўна свабодны і роўны
ўпартых істот не скароных...

**Восень**
(урывак)

*Дз. Шчаснаму*
*А между прочим, осень на дворе...*
М. Рубцоў

***I***
Кастрычніцкая яснасць!.. Як праз шкло,
Прамытае не раз ды таўшчыні належнай,
Ільецца створанае вечнасцю святло,
Сатканае з журбы і радасці бязмежнай.
І песні горнуцца, бы ветразі плывуць,
У словах, знойдзеных і сказаных другімі.
І спее ўласнае. Збірай і не забудзь,
Што так пяецца толькі між сваімі...



***II***
І пракрадзецца досвіткам туман нямы,
Абдыме кветку кожную. І стан яліны дужай.
Счакаўшы раніцу, пад сонца пойдзем мы,
Зямляк і суайчыннік – шчыры дружа –
Адчуць, як у гаі з бяроз, ляшчын, асін
Страсаецца цішком пад кірзавыя боты
Начышчаная медзь, прынадлівы кармін,
Нейтральнасць бляклясці
пры кроплях пазалоты.

***III***
Спакой і цішыня – не маюць меж і мер.
Ахейцы сінявы такой не сустракалі!
Халаднаваты клімат... Быў бы свой Гамер,
Калі яны Руна яшчэ і не шукалі,
А нам – элегіі, санеты... Конь сівы,
Барвовым захадам ружова фарбаваны...
І гэты восень кастрычнік! Залаты,
Да дробязей знаёмы, зноў жа – нечаканы...

***IV***
Быў млын калісь... Праз рэшткі паляў лье
У нізкіх берагах рака струмень халодны.
Спрамляюць рэчышча. Чакае тут яе
Бетонная труба. Над ёю – мост выгодны.
Падыдзем? Пастаім, каб лепей ацаніць
Прыкметы навізны, наканаванай часам.
Цякла – як сонная, тут – пеніцца, бурліць!
І зноў спакойная – пакінулі сам-насам!

***V***

Зусім як чалавек! Ды праз матора гук
Ён нашых разважанняў не пачуе:
З навюткім кошыкам лазовым паляшук
З-пад Пінска на Наваградак шыбуе!
Да тых грыбкоў, што ў кошыку ляжаць,
Зяць прынясе што-кольвечы з сельмага...
Без кроплі ж той – ні быць, ні гасцяваць:
Адолее, замучыць смага...

***VI***

Ах, колькі ж іх было: тых кропель, баразён,
Крывавых мазалёў, крыжа здранцвення,
поту,
Дажджоў заложных, каб буяў драсён,
І тых, чаканых, ссунутых на потым!
Шчасліва, дзядзька! Ўнукаў падтрымай,
Хай доля мачыхай ніколі ім не будзе!
А розных там хвароб, нястач –
о, непачаты край! –
Адолеем і куды-небудзь збудзем!

***VII***

Зноў цішыня. А шэранькі біплан
За хмару лепіцца
ледзь бачнаю стракозкай...

* * *

Астры, дзеці восені любай,
спадарожніцы явы і сноў!..
Холад дзёрзка і шчытна на губы
пульсаваць падштурхоўвае кроў...
Ўсе жыццёвыя колкасці спрэчак
у бяздонную прорву апалі.
Вашы ўсмешкі – апошняй сустрэчы...–
белай пенай на хвалі,
што нясе праз камені на строму.
Вы – усім. Вы – нікому.
Пад няўмольным мароза нажом
род увесь ваш знянацку загіне.
Сэрца чуе, сумуе цішком.
Неба зорыцца, строміцца, стыне...



**Медытацыі**

І прытупіліся пачуцці голаду і смагі –
ляжу ў духмянай цішыні.
Зноў праявіліся і набіраюць бляску і адвагі
яшчэ няясныя, ды чыстыя агні.

У вышыні, не дзеля нас, бо сілай
той непазбежнасці, з якой не саўладаць.
О, нездарма Дэдал маўклівы ладзіў крылы
–
паліла неабходнасць існасць апраўдаць.



...А пад гарою, дзе сяло на грудзе,
вачам маім адсюль нябачнае ўжо аніяк,
сабе і мне запальваюць іх людзі.
Дар Праметэя? Пражывання знак...

Пад локцем мулкасць жвіру – прахалодай,
– пад пальцамі –
падсохлая на ветры поўсць зямлі:
памлела зелле. Ці не з той нагоды
медытаваць са мною з’явы наплылі?

...І чайкі падаліся з возера на Нёман,
да водмеляў начлежных; час і мне –
не блізкі шлях. І думка падсвядома
пясчанаю дарогаю пад зорамі вядзе.

Да раніцы – мо век. Ды доўга не станіцца,
грудзям дасць сілу подых роднай стараны.
І будуць клікаць ўсё далей таемныя
зарніцы,
праводзіць таямнічыя, як вечнасць,
кажаны...

* * *

*А. Бакачу*

*...у нячуты павер запавет,*
*палюбі непазнаную мэту...*

А. Разанаў

За пасмам бору, ўжо за даляглядам!..–
па лапінах іржышча, па ральлі
калі і кім пасеяна прынада?
Чые зярняты радасна ўзышлі?

Ня быў ніколі там... А мусіць, і ня буду –
што не сабраць, а дзе і не дайсьці:
сплываюць дні без нашага прысуду
у хуткаплынным ручаі – жыцьці...

Няўмольны час гадзіну за гадзінай
зрывае з дрэва існасьці тваёй.
І толькі хмар і ветру безупынны
праход, пралёт і сьвіст над галавой...

А там... такая позьняя ўжо восень,
што лістапад, яе апошні сын,
ужо і промня цёплага ня просіць
для схаладалых, голых арабін.

І гнецца вецьце!.. І парывам новым
страсае гронкі, бы жывую кроў,
на незаменную нічым аснову
халоднай гліны, мокрых верасоў.

А ўжо і прыцемкі – наканавана.
І цемра цяжкая лягла на ўсё.
А заўтра? Сонцам мо спавіты ранак,
такі, які адзін за ўсё жыцьцё.

Каб нехта ўбачыў – слаўны міг удачы!..–
ня слотай змучаны, здранцвелы лог,
а рай зямны для ўсіх – і не іначай! –
ступіўшы там, дзе я прайсьці ня змог.